**А. Трафімчык**

# УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА І ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Гісторыя ўніяцтва прасякнута імкненнем захаваць і ўмацаваць беларускую плынь і стараславянскі дух, барацьбой за сваю самабытнасць і дыстанцыраваннем ад каталіцызму, найперш у яго польскай форме. Так было заваяванае права прызначаць на духоўныя пасады толькі людзей “руского народу и их власное религии”. Іерархія была беларуска-ўкраінскага паходжання і насуперак стэрэатыпам праводзіла інтарэсы сваіх народаў, а не заходніх суседзяў. Уніяцкая царква рэлігійна і этнічна дыферэнцавала ўніятаў ад палякаў, з’яўлялася бар’ерам, які абараняў сялянства ад лацінізацыі, чым стрымлівала дэнацыяналізацыю этнасу.

Беларускай (“рускай” паводле крыніц) мове царква дала поўнае права грамадзянства ва ўсіх сферах сваёй дзейнасці, акрамя літургічнай. Дзеячы уніі ўзаконілі ў 1636 г. яе выкарыстанне ў сваёй царкве. Беларускае кнігадрукаванне фактычна было толькі ў манастыры ў Супраслі.

Сярод прыхаджан уніяцкіх парафій пашырылася ўсведамленне сябе нейкай адметнай супольнасцю. Так, на працягу ўсяго існавання ўніяцкай царквы часцей за ўсё яе прыхаджане вызначалі сваю этнічную прыналежнасць праз

прыналежнасць да "суперэтнасу" Русь. Радзей сярод уніятаў сустракаецца этнонім "ліцвіны", звязаны з прыналежнасцю да дзяржавы – ВКЛ. Рэдкім было атаясамліванне сябе з палякамі. Але з памежжа XVIII–XIX стст. уніятаў пачалі атаясамліваць з беларусамі. Па энцыклапедыі "Этнаграфія Беларусі" ў XVII–XVIII стст. з узнікненнем паняцця *Белая Русь* паступова ў шырокі ўжытак увайшло і паняцце *беларуская вера*, пад якой мелася на ўвазе ўніяцтва. З канца XVIII ст. ва ўніяцкім асяроддзі і кантактуючых з ім урадавых сферах пашыраецца ўжыванне этноніма "беларускі" ў дачыненні да яго культавых інстытутаў і вернікаў, галоўным чынам усходніх раёнаў Беларусі. Арэал распаўсюджання ўніяцтва супадае з этнічнай беларускай тэрыторыяй, якой яе пазначыў на сваёй карце Я. Карскі. У XIX ст. менавіта з уніяцкіх колаў выйшла значная частка дзеячаў беларускага адраджэння. Уніяцкаму духавенству былі блізкія лёсы Айчыны: удзел Карскага ў паўстаннях Касцюшкі, спачувальныя адносіны да паўстання Каліноўскага.

Такім чынам, уніяцтва, нароўні з іншымі канфесіямі, асабліва з праваслаўем, у значнай ступені паўплывала на фарміраванне ў беларусаў усведамлення сябе асобнай этнічнай супольнасцю без адрыву ад агульнай усходнееўрапейскай супольнасці. Таксама ўніяцкая духоўная інтэлігенцыя ў значнай ступені фармавала самасвядомасць беларусаў, выхоўваючы іх у духу любові да Айчыны, адданасці свайму краю, талерантнасці (праз здольнасць прымірыць у сваёй веры два адгалінаванні хрысціянства), павагі да працы і навукі, выкрышталёўваючы этнічную свядомасць.